жр 3227

Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Прачытаў—перадай другому.

Комуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# Совецкі патрыёт

ОРГАН ЛЯХАВІЦКАГА РК КП(б)Б

№ 7 | Чацвер 16 снежня | 1943 г.

**Няхай жыве перамога англа-совецка-амерыканскага баявога саюза над злейшымі ворагамі чалавецтва — нямецка-фашысцкімі прыгнятальнікамі!**

## Важны ўклад у агульную справу саюзнікаў.

У Маскве паспяхова закончыла сваю работу канферэнцыя Міністраў Замежных Спраў Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі і Совецкага Саюза. Канферэнцыя працягвалася 12 дзён. Яшчэ задоўга да таго, як Міністры трох саюзных дзяржаў сабраліся ў совецкай сталіцы, увага сусветнай грамадскасці была ўжо прыцягнута да чакаемай нарады. Яна не аслабла і ў час самой канферэнцыі. Увага гэта сведчыць аб значэнні, якое надаюць народы растучаму супрацоўніцтву трох вялікіх дзяржаў у пытаннях вядзення вайны і ўстанаўлення будучага міра.

На канферэнцыі прыняты важныя рашэнні. Першае, на чым аднадушна сышліся прадстаўнікі трох урадаў, гэта—прызнанне сваёй першай мэты паскарэння канца вайны. На канферэнцыі аднадушна прызнана неабходным прыняць зараз-жа меры да таго, каб аб'яднанымі ўдарамі з Усхода і Захада паставіць гітлераўскую Германію на калені і паскорыць час яе канчатковага разгрома.

Другім важнейшым пытаннем работы канферэнцыі з'яўляецца рашэнне прадоўжыць сучаснае супрацоўніцтва Вялікабрытаніі, Совецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі і на пярыяд, які наступіць па скончэнні ваенных дзеянняў. Англа-совецка-амерыканскі саюз павінен забяспечыць не толькі перамогу над ворагам, але і арганізацыю міра пасля вайны. Гэта адбіта ў адным з асноўных дакументаў Канферэнцыі—Дэкларацыі па пытанню ўсеагульнай бяспечнасці. Да гэтай Дэкларацыі далучыўся таксама Кітайскі ўрад. Значыць яна выражае волю і рашэнне чатырох найбольшых дзяржаў зямлі, прынімаючых на сябе адказнасць за будучую арганізацыю міра. Урад Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі, Совецкага Саюза і Кітая абвяшчаюць, што іх сумесныя дзеянні „будуць прадоўжаны для арганізацыі і падтрымання міра і бяспечнасці". Чатыры найбольшых краіны свету прызналі неабходным стварыць Усеагульную Міжнародную Арганізацыю для падтрымання міжнароднага міра і небяспечнасці, аснованай на роўнасці ўсіх міралюбівых краін — вялікіх і малых.

Гэтай Дэкларацыяй закладываюцца першыя камені ў фундаменце пасля ваеннага часу. Вялікія дэмакратычныя краіны—таварышы па зброі сягоння, заўтра яны стануць таварышамі ў барацьбе за бяспечнасць народаў, сумесна возьмуцца за арганізацыю міжнароднага супрацоўніцтва ў пасляваенны пярыяд.

Пры такім супрацоўніцтве паміж саюзнымі краінамі натуральна ўзнікла неабходным у стварэнні пастаяннага органа для забяспячэння далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж урадамі Англіі, Совецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. Канферэнцыя трох Міністраў рашыла стварыць такі орган для вывучэння еўрапейскіх пытанняў, устанавіўшы ў Лондане Еўрапейскую Кансультацыйную Камісію.

Апрача гэтага рашано стварыць спецыяльны Кансультацыйны Совет па пытанням Італіі. Выдзяленне такога совета дыктуецца двумя асноўнымі акалічнасцямі. Па-першае, у яго склад уключаюцца апрача прадстаўнікоў Злучаных Штатаў Амерыкі, Англіі і Совецкага Саюза, прадстаўнікі Французскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення, я таксама прадугледжана ўключэнне прадстаўнікоў Грэцыі і Югаславіі, пацярпеўшых ад фашысцкай Італіі.

Па-другое, асаблівасць Совета па пытанням Італіі заключаецца ў тым, што яму прыйдзецца займацца пытаннямі, звязанымі з правядзеннем палітыкі саюзнікаў на тэрыторыі Італіі, дзе ўжо праходзіць ліквідацыя фашысцкай сістэмы.

Вось чаму Канферэнцыя выпрацавала таксама спецыяльную „Дэкларацыю аб Італіі". У гэтай дэкларацыі Міністры 3-х саюзных краін заяўляюць аб асноўных прынцыпах сумеснай палітыкі іх урадаў. Гэтыя прынцыпы заключаюцца ў тым, што „фашызм і ўсе яго пагубныя ўплывы і вынікі павінны быць поўнасцю знішчаны". Гэта Дэкларацыя пакажа і іншым народам—ахвярам фашысцкай тыраніі—іх заўтрашні дзень, калі яны з дапамогаю Совецкага Саюза, Англіі і Злучаных Штатаў Амерыкі, скінуць фашысцкіх прыгнятальнікаў.

У гэтых адносінах знаменальна прынятая, на Канферэнцыі „Дэкларацыя аб Аўстрыі". Аўстрыя была першай свабоднай краінай, стаўшай ахвярай гітлераўскай агрэсіі.

Урады Англіі Совецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі заяўляюць, што гвалтоўнае прылучэнне Аўстрыі да Германіі ў 1938 годзе з'яўляецца несапраўдным. Аўстрыя павінна быць вызвалена ад германскага панавання. Аб'яўляючы аб устаўленнні незалежнасці Аўстрыі

(Працяг гл. на 2-ой старонцы).

жр 3227



## Важны ўклад у агульную справу саюзнікаў.

(Працяг, пачатак глядзі на 1-ай староцы)

саюзныя ўрады звяртаюць увагу Аўстрыі на тое, што яна нясе адказнасць за ўдзел у вайне на старане гітлераўскай Германіі. Пры канчатковым разглядзе ўсіх пытанняў будзе прыняты на ўвагу ўласны ўклад аўстрыйскага народа ў справу вызвалення Аўстрыі.

З асаблівым пачуццём задавальнения прымуць совецкія людзі і ўсе народы, пацярпеўшыя ад фашысцкага разбоя, выпушчаную ў час Маскоўскай Канферэнцыі сумесную Дэкларацыю Глаў трох Урадаў— Рузвельта, Чэрчыля і Сталіна „Аб адказнасці гітлераўцаў за тварымыя зверствы“. У гэтай Дэкларацыі правазглашаецца, што любы гітлеравец, учыніўшы зверства, забойствы і казні у акупіраванай немцамі краіне, будзе знойдзен „дажа на краю света“. Кожны злодзей будзе адасланы ў краіну, дзе ён утварыў свае зладзействы, яго будуць сурова судзіць м а с ы па законам тэй краіны ў якой ён зрабіў праступленне

Нямецкія салдаты і афіцэры, „хто яшчэ не запляміў сваіх рук нявіннай кроўю,“ папярэджваюцца, каб яны не сталі ў ліку віноўных належачых правасуддзю.

Маскоўская Канферэнцыя прадэманстрыравала рашымасць і волю народаў трох вялікіх дзяржаў давесці справу барацьбы з нямецка-фашысцкімі разбойнікамі да канца, паскорыць разгром ворага, прыблізіць час перамогі нашай агульнай справы. Яна наносіць новы сур'ёзны ўдар па гітлераўскаму лагеру, ваенная магутнасць якога надломлена і глыбока патрэсена магутнымі ўдарамі с о в е ц к і х войск на Ўсходзе, а таксама сур'ёзнымі поспехамі англа-амерыканскіх войск на Захадзе.

Значэнне Маскоўскай Канферэнцыі ў тым, што яна выразіла імкненні народаў саюзных краін да далейшага з'яднання сваіх сіл супроць агульнага ворага і супрацоўніцтву ў пасляваенны пярыяд у інтарэсах міра і безапаснасці народаў.

## Саглашэнне аб супрацоўніцтве паміж СССР і Чэхаславакіяй

### (АБ ДРУЖБЕ І ВАЕННАЙ ДАПАМОЗЕ).

12 снежня 1943 г. у Маскве было падпісана саглашэнне аб супрацоўніцтве паміж СССР і Чэхаславакіяй аб дружбе і ваеннай дапамозе.

Саглашэнне падпісалі ад СССР—Молатаў, ад Чэхаславакіі — Берменгенер.

Прысутнічалі ад СССР— Сталін, Калінін, Варашылаў, Карнейчук, Лебядзеў і іншыя.

Ад Чэхаславакіі — Бенеш, Кроўс,Ніжагорскі, Робеаскі, генерал-майёр Кракоўскі.

## Весткі з франтоў.

12 снежня нашы войскі на кіравоградскім напрамку вялі наступальныя баі ў выніку якіх занялі рад населяных пунктаў: Зялёны Гай, Багданаўка, Мазуравічы, Матронаўка, Нова-Нікалаеўск і інш. На захад ад Крэменчуга нашы войскі прарвалі абарону праціўніка, занялі райцэнтр Чыгірын і населяныя пункты Пушчыя, Белакаменка, Херсонка і інш.

На поўдзень і паўднёвы захад гор. Марыно заняты рад населяных пунктаў.

За 11 снежня знішчана 66 танкаў і 37 самалётаў праціўніка.

Нашы войскі вызвалілі горад і чыгуначны вузел Знаменка. Пры заняцці ўзяты наступныя трафеі танкаў і бронемашын— 94, аўтамашын—684, гармат— 152, вазоў з грузам—453, кулямётаў—373, матацыклаў і веласіпедаў—420; бронетранспарцёраў—52, складаў—32.

### ГОРАД ЧЭРКАСЫ ВЫЗВАЛЕНЫ

Войскі 2-га Украінскага фронта 14 снежня аўладалі галоўным вузлом абароны немцаў на правым беразе Днепра г. Чэркасы.

16 снежня на паўднёвы ўсход ад г. Чэркасы нашы войскі прадаўжалі наступленне і занялі рад населяных пунктаў.

8-ая армія саюзнікаў працягвала наступленне, адбіла шэраг контратак і прычыніла страты праціўніку.

Авіяцыя саюзнікаў падвергла бамбардыроўцы Італію і аэрадромы ў ваколіцах гор. Рыма.

## З-ЗА ГРАНІЦЫ

## Федэратыўны ўрад у Югаславіі

Рашэннем канферэнцыі народных партый у Югаславіі на тэрыторыі занятай партызанамі ўстаноўлен часовы федэратыўны ўрад. Начале ўрада— Іван Рыба. Старшыня камітэта нацыянальнай абароны— Браслето і шэраг іншых асоб уваходзячых у ўрад.

Кароль Пётр адобрыў данае рашэнне баявой сілы югаслаўскіх партызан колькасцю ў 200 тыс. чалавек. Кароль Пётр мае 15 тыс. чалавек. Англійская палата абшчын адобрыла створаны часовы ўрад у Югаславіі і аказвае ўсямерную дапамогу і падрымку гэтаму ўраду, больш, чым ураду караля, матывіруючы тым, што гэты урад вядзе актыўную барацьбу супроць фашызма.

## ДАКЛАД З ВЯЛІКАЙ ЗЯМЛІ

У в. Ш. Ляхавіцкага раёна, быў прачытаны і абмяркованы даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны т. І. В. Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных. Старыя і дзеці слухалі даклад з Вялікай Зямлі. Усе былі ўскалыхнуты і падняты духам бодрай прамовы правадыра. Асабліва з глыбокім абурэннем і нянавісцю да нямецка-фашысцкіх разбойнікаў, слухалі сяляне ў дакладзе т. Сталіна аб знішчэнні фашыстамі нашых мірных людзей і апусташэнні нашай зямлі. Простыя, праўдзівыя словы даклада т. Сталіна глыбока запалі ў сэрца сялян. Усе актыўна абавязаліся дапамагаць з тыла Чырвонай Арміі, каб паскорыць час вызвалення роднай Беларусі.

Партызан
Сяргей М.

РЭДКАЛЕГІЯ

Выданне Ляхавіцкага РК КП(б)Б